# СТЫХІЯ НАРАБІЛА БЯДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У выніку парываў ветру ад паваленых дрэў і элементаў дахаў загінулі пяць чалавек, з іх два дзіцяці, траўмаваныя пяць чалавек, з іх чатыры дзіцяці.

У Магілёўскім раёне з-за непагадзі загінула пяцігадовая дзяўчынка, якую прыціснула паваленым дрэвам. Паводле папярэдняй інфармацыі, увечары 14 ліпеня дзяўчынка з мамай і цёткай накіроўваліся на электрычку да чыгуначнага прыпыначнага пункта «Тэкстыльшчык». Раптам у дарозе іх заспела непагадзь. Моцныя парывы ветру прывялі да падзення дрэў, пад адным з якіх апынуліся жанчыны і малая. Ад удару бярозы маці дзяўчынкі страціла прытомнасць, а дзяўчынку прыціснула ствалом. Другая жанчына абышлася нязначнымі ўдарамі і пачала даставаць пацярпелых з-пад дрэва, а затым выклікала «хуткую». Нягледзячы на аператыўныя рэанімацыйныя дзеянні медыкаў, дзіця памерла ў машыне хуткай дапамогі.

У нядзелю таксама ў Рэчыцкім раёне ў выніку падзення дрэў пацярпелі дзеці, адно з іх загінула. Трагічны выпадак адбыўся на тэрыторыі дзіцячага аздараўленчага лагера імя Марата Казея. Раптам разбушавалася стыхія, падчас якой адбылося імклівае падзенне некалькіх дрэў. У гэты час на канцэртнай пляцоўцы праходзіла забаўляльнае мерапрыемства для выхаванцаў лагера. Калі пачалася бура, дзеці кінуліся ў жылыя карпусы.

«Па папярэдніх даных, пры падзенні дрэў і абламаных галін пацярпела сем выхаванцаў лагера. У выніку атрыманых цялесных пашкоджанняў памёр 13-гадовы хлопчык. Розныя траўмы атрымалі яшчэ шэсць дзяцей ва ўзросце ад 7 да 13 гадоў», — сказана ў паведамленні Следчага камітэта.

Лагер імя Марата Казея размешчаны за 32 кіламетры на поўнач ад Рэчыцы, на правым беразе ракі Бярэзіна ў зоне змешанага лесу.

«Брыгады хуткай медыцынскай дапамогі даставілі траіх пацярпелых дзяцей у цэнтральную раённую бальніцу. Пасля папярэдняй дыягностыкі было прынята рашэнне адну з дзяўчынак, дыягназ траўмаў якой патрабуе лячэння ў бальніцы абласнога ўзроўню, перавесці ў Гомель. Двум падлеткам аказана дапамога ўрачамі ЦРБ. У дзяцей дыягнаставаныя пераломы і траўмы сярэдняй ступені цяжкасці», — каментуе тое, што адбылося, Міністэрства аховы здароўя.

«На сёння ў дзвюх бальніцах вобласці застаецца на лячэнні два дзіцяці. Адно — у дзіцячай абласной бальніцы Гомеля (стан цяжкі, стабільны), другое дзіця (стан сярэдняй ступені цяжкасці) знаходзіцца ў ЦРБ Рэчыцы», — распавялі ў прэс-службе. Яшчэ аднаго шпіталізаванага ў цэнтральную раённую бальніцу Рэчыцы пасля аказання неабходнай медыцынскай дапамогі забралі дадому бацькі.



Фота БелТА.

У суботу з-за непагадзі загінулі два чалавекі: з-за паваленага дрэва на кемпінгу «Клёвае месца» ў Вілейскім раёне памёр мужчына, у Мінску каля Цнянскага вадасховішча смяротную траўму атрымала дзяўчына.

Як аказалася пазней, у Светлагорску пенсіянера да смерці прыціснула паваленым дрэвам. Па даных следства, увечары 14 ліпеня ўраган заспеў 90-гадовага мужчыну па дарозе дадому. Моцныя парывы ветру павалілі дрэва прама на пенсіянера. Ад атрыманых траўмаў ён памёр у бальніцы. На месцы здарэння працавала следча-аператыўная група. Трагедыя трапіла на камеру вонкавага відэаназірання. Следчыя высветлілі, што мужчына не дайшоў да свайго дома ўсяго пару сотняў метраў.



Фота з сайта МНС.

З прычыны нядзельнага праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру да 29 м/с пацярпелі 268 населеных пунктаў у Брэсцкай (12), Гомельскай (249) і Магілёўскай (7) абласцях. Пашкоджаны дахі 586 жылых дамоў, 7 аб'ектаў сацкультбыту і 146 сельскагаспадарчых будынкаў.

У Добрушы Гомельскай вобласці па вуліцы Палявой, 43 адбылося абвальванне 50 квадратных мераў уцяпляльніка з блокаў сцяны пяціпавярховага шматкватэрнага жылога дома. Апорныя канструкцыі дома не пашкоджаны. Вядуцца аднаўленчыя работы.

Зафіксаваныя 819 выпадкаў падзення дрэў у Брэсцкай (23), Гомельскай (404), Мінскай (8) і Магілёўскай (384) абласцях і ў Мінску (11). Паваленымі дрэвамі пашкоджаныя 55 аўтамабіляў у Гомельскай (46), Мінскай (1) і Магілёўскай (8) абласцях. Работнікамі выратавальнага ведамства і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і ўборцы паваленых дрэў.

Энергетыкі працягваюць аднаўленчыя работы пасля разгулу стыхіі ў 1,2 тысячы населеных пунктаў, паведамляе прэс-служба з Міністэрства энергетыкі.

У ведамстве нагадалі, што навальнічны фронт з лівямі і шквалістым ветрам, парывы якога дасягалі 25—30 м/с, месцамі — з градам, стаў прычынай падзення дрэў і галінак на лініі электраперадачы, іх абрыву, пашкоджання апор. У нядзелю электразабеспячэнне парушалася ў 1960 населеных пунктах краіны. Да ліквідацыі наступстваў навальнічнага фронту брыгады энергетыкаў прыступілі аператыўна.

Так, адключэнні зафіксаваныя пераважна ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Больш за ўсё з-за непагадзі пацярпелі Мазырскі, Рэчыцкі, Гомельскі, Клімавіцкі, Петрыкаўскі, Жлобінскі, Быхаўскі, Чэрыкаўскі і Магілёўскі раёны.

Па даных на 15 ліпеня, аднаўленчыя работы працягваюцца ў 1263 населеных пунктах. У ліквідацыі наступстваў непагадзі задзейнічаныя 322 аварыйныя брыгады складам 805 чалавек і 327 адзінак тэхнікі. Брыгады працуюць у кругласутачным рэжыме.

Паводле інфармацыі Беларускай чыгункі, з-за падзення дрэў на чыгуначныя пуці затрымка ў руху 46 цягнікоў у Гомельскай і Магілёўскай абласцях склала ад 6 хвілін да 7 гадзін 50 хвілін. У лясах Беларусі ў выніку непагадзі агульны аб'ём правядзення суцэльных санітарных высечак складзе не менш за 2,3 тысячы гектараў. У прэс-службе Мінлясгаса дадалі, што абследаванне ўчасткаў ляснога фонду працягваецца. «Гэтая лічба можа яшчэ вырасці», — падкрэслілі ў ведамстве. Зараз сілы работнікаў галіны размеркаваны па двух напрамках: аператыўная расчыстка дарог і ліній электраперадачы, а таксама абследаванне ўчасткаў ляснога фонду для вызначэння неабходных аб'ёмаў распрацоўкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.

## Чаму адбываюцца такія катаклізмы?

Сваім меркаваннем падзяліўся **акадэмік НАН Беларусі Уладзімір ЛОГІНАЎ.** «Ёсць падставы чакаць далейшае павышэнне тэмпературы ў Беларусі і на планеце ў цэлым», — разважае кліматолаг. Апошнім часам спецыялісты адзначаюць сілу і хуткасць змены надвор'я. Уладзімір Логінаў удакладняе, што ападкі ўсё часцей выпадаюць нераўнамерна. У апошнія трыццацігоддзе іх колькасць скарацілася прыблізна на 5—10 працэнтаў у чэрвені і жніўні, але настолькі ж вырасла ў ліпені. Што прынцыпова важна — стала больш лівняў. Колькасць спрыяльных для ўраджаю ападкаў, на жаль, не расце.

«Па сутнасці, смерч — гэта прарыў халоднага паветра з высокіх слаёў на вельмі цёплую падсцілаючую паверхню. І чым падсцілаючая паверхня цяплейшая, тым вышэй верагоднасць узнікнення смерчу. У апошнія гады часцей адбываецца дысбаланс велічынь выпарэння і ападкаў».

А ў суботу і нядзелю гэтая «паверхня» ў нашай краіне разагрэлася да максімальных тэмператур.

«Далей насычанае вільгаццю паветра з паверхні Зямлі падымаецца ўверх і кандэнсуецца, вызваляючы дадатковую энергію. Ціск унутры віхуры змяняецца з такой хуткасцю, што не паспявае выраўняцца з ціскам каля паверхні Зямлі».

Спрагназаваць гэтую прыродную з'яву вельмі цяжка, лічыць спецыяліст. Смерч мае памеры ад некалькіх метраў да сотняў метраў і праходзіць вузкай паласой, так што непасрэдна на метэастанцыі значнага ўзмацнення ветру можа і не быць.

Непрыемнасцяў можа нарабіць не толькі смерч, але і шквал. Хай гэта з'ява надвор'я не такая эфектная, як смерч, але яго наступствы не менш катастрафічныя. Падчас шквалу вецер рэзка набірае сілу і дзьме з вялікай хуткасцю. Але нядоўга. І заканчваецца таксама рэзка, як і пачынаецца. Нельга адназначна сказаць, што шквалаў цяпер стала больш, чым раней. На самай справе шквалы часцей рэгістраваліся ў канцы 1960—1970-х гадоў. Але нам ад гэтага не лягчэй...

## Тым часам

### Максімальная тэмпература апусціцца да 30 градусаў толькі ў чацвер

А ў аўторак умовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць цёплая няўстойлівая паветраная маса. Чакаецца пераменная воблачнасць. Месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах туман. Вецер няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 15 да 21 цяпла, максімальная днём зноў павысіцца да 28—34 градусаў, па поўдні — месцамі да 35 спёкі. Атмасферны ціск істотна не зменіцца.

Чарговая порцыя актыўнай непагадзі чакае нас у сераду. У гэты дзень, 17 ліпеня краіна апынецца пад уплывам актыўнай сістэмы франтоў, якія ссоўваюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, якія месцамі будуць перарастаць у моцныя дажджы, навальніцы, магчымы град. Вецер паўднёвай чвэрці, днём з пераходам на заходні ўмераны, месцамі парывісты, **пры навальніцах (увага!) моцны парывісты.** Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад 15 градусаў да 22 цяпла, а максімальная днём ад 24 градусаў да 31 цяпла, па паўднёвым усходзе — 32—36 градусаў.

Паўночна-заходні вецер «уключыць» нам пахаладанне, але не ўсюды. У чацвер умовы надвор'я будзе вызначаць няўстойлівая паветраная маса, якая распаўсюджваецца з Заходняй Еўропы. Чакаецца пераменная воблачнасць. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўночна-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да 14—20 градусаў, але на паўднёвым усходзе будзе душна — 22 цяпла, удзень — 23—30 цяпла.

У пятніцу надвор'е чакаецца пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы дасягне (летам амаль холаду) — плюс 11—18 градусаў, а днём — 22—29 цяпла.

У суботу ноччу месцамі па поўначы, а днём у паўночных і цэнтральных раёнах рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі згусціцца слабы туман. Халодныя ночы дазволяць нам выспацца за тыдзень. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 11 да 16 градусаў, а ўдзень — ад плюс 19 градусаў на поўначы да плюс 29 градусаў на паўднёвым захадзе.

У нядзелю ад душных начэй ні застанецца і следу, ды і днём будзе злёгку зябка. У гэты дзень месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, днём магчымыя навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах згусціцца слабы туман. Уначы сіноптыкі абяцаюць плюс 10—16 градусаў, а ўдзень — ад 21 градуса на паўночным усходзе да 30 градусаў цяпла на паўднёвым захадзе краіны.